# Краязнаўчая бібліяграфія: традыцыйныя каштоўнасці і новыя тэндэнцыі

***І. І. Жэленгоўская,***
*загадчык аддзела краязнаўства*
*Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага*

Сёння краязнаўчай бібліяграфіі належыць важная роля ў сістэме інфармацыйных рэсурсаў Беларусі. Кожны бібліёграф павінен валодаць методыкай краязнаўчай работы. Краязнаўству надаецца шмат увагі на дзяржаўным узроўні, найперш у аспектах патрыятычнага выхавання і стварэння прывабнага іміджу з пункту гледжання культурнай і гістарычнай спадчыны рэгіёну ў краіне і за яе межамі.

Па вызначэнні кандыдата педагагічных навук, дацэнта Таццяны Васільеўны Кузьмініч краязнаўчая бібліяграфія — гэта від бібліяграфіі, у межах якой ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб дакументах, створаных на тэрыторыі краю і/ці прысвечаных яму. Аб’ектам краязнаўчай дзейнасці бібліятэк з’яўляюцца творы друку і іншыя носьбіты краязнаўчай інфармацыі, якія маюць дачыненне да краю: па змесце, месцы выданні, аўтарскай прыналежнасці і г. д.

Бібліяграфічнае краязнаўства займае важнае месца ў працы Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага. Аддзел краязнаўства — цэнтар краязнаўчай дзейнасці. У яго склад уваходзіць сектар рэгіянальнай бібліяграфіі і інфармацыі па культуры і мастацтву. Супрацоўнікамі аддзела на прадмет краязнаўства апрацоўваецца каля 150 назваў беларускіх перыядычных выданняў, а таксама сборнікі, якія трапляюць у Бібліятэку; прымаецца ўдзел у стварэнні краязнаўчых рэтраспектыўных і бягучых бібліяграфічных дапаможнікаў. У адборы дакументаў і фарміраванні запісаў удзельнічаюць усе супрацоўнікі аддзела краязнаўства, праглядаючы de visu новыя паступленні і перыядычныя выданні.

Асноўным зместам работы аддзела краязнаўства з’яўляецца: выяўленне, збор, арганізацыя, захаванне і выдача для карыстання чытачам краязнаўчых і рэгіянальных друкаваных дакументаў. У гэтым дапамагае аб’ёмны даведачна-бібліяграфічны апарат, які ўключае:

– традыцыйны (картачны) краязнаўчы сістэматычны каталог (вядзецца з канца 1940 — пачатку 1950-х гг., на сёння налічвае каля 500 000 бібліяграфічных запісаў);

– храналагічны каталог мясцовых выданняў (вядзецца з 1957 г., на сёння налічвае больш за 14 000 картак);

– алфавітны каталог газет і часопісаў Брэсцкай вобласці (вядзецца з 1969 г., мае больш за 300 картак);

– краязнаўчы алфавітны каталог кніг (аб’ём на сёння — больш за 18 000);

– алфавітны каталог кніг аддзела (вядзецца з 1969 г., каля 34 000 картак).

Вялікая ўвага надаецца стварэнню тэматычных і персанальных паказальнікаў.

Два разы на год выходзіць універсальны бягучы паказальнік «Новая літаратура аб Брэсцкай вобласці», прадстаўлены таксама на сайце нашай установы. Паказальнік адлюстроўвае як кнігі, так і артыкулы з рэспубліканскага і мясцовага перыядычнага друку, цалкам ці часткова прысвечаныя краю і забяспечвае бягучае інфармаванне аб новых краязнаўчых матэр’ялах. Уключае кнігі (манаграфіі, зборнікі, матэр’ялы канферэнцый, артыкулы з часопісаў і газет (у т. л. раённых) і іншыя матэр’ялы, якія маюць непасрэднае дачыненне да краю, незалежна ад мовы і месца выдання. Яго структура адпавядае класіфікацыі краязнаўчых дакументаў. Прысутнічаюць імянны і геаграфічны дапаможныя паказальнікі. Падрыхтоўка выдання ажыццяўляецца ў аўтаматызаваным рэжыме. Фарміраванне адбываецца праз краязнаўчы рубрыкатар — поле 690, у сувязі з чым звяртаем вашу ўвагу на неабходнасць яго запаўнення пры аналітычнай апрацоўцы вашай раённай перыёдыкі.

Безумоўна, асноўнымі крыніцамі пошука краязнаўчай інфармацыі з’яўляецца бібліяграфічная база даных, якая ўваходзіць у склад электроннага каталога — «Краязнаўчая літаратура». База змяшчае апісанні артыкулаў з кніг, газет і часопісаў па краязнаўству. Пачала фарміравацца ў 1999 г. і на сёнішні дзень налічвае больш за 103 000 запісаў, папаўненне яе непасрэдна супрацоўнікамі аддзела краязнаўства — каля 6000 запісаў у год. Зараз ідзе плённая праца па стварэнні Рэгіянальнага зводнага электроннага каталога бібліятэк Брэсцкай вобласці.

Сучасны стан і перспектывы развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ў галіне краязнаўства знайшлі сваё адлюстраванне ў новым Палажэнне аб краязнаўчай дзейнасці бібліятэк РБ. Палажэнне было распрацавана ў 2020 г. навукова даследчым аддзелам бібліяграфіі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у гэтым жа годзе адобрана Саветам бібліятэк Беларусі па інфармацыйным узаемадзеянні і ў 2021 г. зацверджана Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй. Супынімся 6 пункце 6 главы Палажэння — Каталагізацыя краязнаўчых і мясцовых дакументаў. Адлюстраванне краязнаўчага кантэнту ў сістэме карпаратыўнай каталагізацыі.

БЗ на краязнаўчыя і мясцовыя дакументы павінны адпавядаць запатрабаванням даступнасці, паўнаты і якасці, што забяспечваецца:

– выкарыстаннем нацыянальнага камунікатыўнага фармату (BELMARC) ці аднаго з міжнародных фарматаў, што забяспечвае даступнасць інфармацыі для іншых бібліятэк і карыстальнікаў;

– абавязковым апісаннем de visa дакументаў, месца захоўвання якіх вядома, выкарыстаннем для аналізу дакументаў дадатковых крыніц інфармацыі (пры неабходнасці);

– паўнатой бібліяграфічнай характарыстыкі, г. зн. запаўненнем усіх палёў і падпалёў фармату са статусамі «абавязковы» і «умоўна абавязковы» у адпаведнасці з патрабаваннямі дзеючых стандартаў і правілаў каталагізацыі;

– стварэннем усіх неабходных пунктаў доступу на нацыянальныя / рэгіянальныя аб’екты

*(забяспечваць навуковы ўзровень раскрыцця зместу краязнаўчага дакумента, якое павінна быць максімальна поўным і якасным. Гэта тычыцца палёў тэматычнага блоку (імя асобы, назва арганізацыі, геаграфічныя аб’екты). Можа быць, што аб’ект краязнаўчай інфармацыі ў тэксце зусім не значны, але прыведзеныя звесткі прадстаўляюць цікавасць для даследчыкаў, магчыма яны малавядомыя ці ўнікальныя. У такім выпадку іх абавязкова трэба адлюстроўваць у БЗ.);*

– глыбінёй сэнсавай апрацоўкі, складаннем максімальна поўных пошукавых вобразаў дакументаў;

– выкарыстаннем анатацыі ў выпадках невыразнай ідэнтыфікацыі дакумента як нацыянальнага / краязнаўчага

*(У выпадках невыразнай ідэнтыфікацыі дакумента праз яго назву (з бібліяграфічнай назвы немагчыма зразумець яго змест) мэтазгодна прымяняць анатаванне.). Анатацыі павінны быць кароткія, дакладныя, лагічна звязаныя і граматна аформленыя, з раскрыццём краязнаўчага характара дакумента. Пры складанні анатацыі паказваюцца звесткі пра змест дакумента, пра дачыненне аўтара да рэгіёну, асабліва калі аўтар малавядомы.).*

Кожны бібліёграф ведае, што кнігавыдача бібліятэкі на 90 % залежыць ад таго наколькі якасна прапісаны фонды бібліятэкі ў бібліятэчных інфармацыйных сістэмах (БД і каталогах). Асабліва гэта датычыцца краязнаўчых БД. З узмацненнем карпаратыўнага ўзаемадзеяння і функцыянавання зводнай інфармацыйна-пошукавай сістэмы ў частцы бібліяграфіі мясцовага друку (якая з’яўляецца складаючай нацыянальнай бібліяграфіі) больш надзённым стала прымяненне аднатыпных метадычных падыходаў у аналітычным бібліяграфіраванні. Але стварэнне якаснай бібліяграфінай інфармацыі на краязнаўчы дакумент ажыццяўляецца з улікам рэгіянальнай спецыфікі. Бібліяграфія — працэс творчы і суб’ектыўны. У сувязі з гэтым ёсць шэраг праблем у сферы інфармацыйнага супрацоўніцтва ў

краязнаўчай бібліяграфічнай дзейнасці. Гэта і крытэрыі адбора інфармацыі. Адрознае разуменне важнасці інфармації абласной і раённай бібліятэкі. У выніку чаго даволі часта мы сутыкаемся са з’явай «інфармацыйнага шума». Гэта і праблема адставання па аналітычнай апрацоўцы краязнаўчых дакументаў. Павялічваецца нагрузка на бібліёграфаў. Павялічваецца колькасць краязнаўчых выданняў, з’яўляюцца новыя накірункі працы.

Гісторыя роднага краю заўсёды прыцягвала ўвагу не толькі навукоўцаў-спецыялістаў але і людзей самых розных сацыяльных і прафесійных слаёў. Кожная бібліятэка — гэта комплекс літаратуры і методык працы, адаптаваных да патрэб карыстальніка. Бібліяграфічнае адлюстраванне гісторыка-культурнага асяродку Берасцейшчыны важны і неабходны працэс у справе бібліятэчных установ рэгіёну.